Том 12 • 2012 ACTA ALBARUTHENICA ISSN 1898-8091

**Анжэла Мельнікава**
Гомель

# Праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці ў публіцыстыцы Вацлава Ластоўскага

Праблема нацыянальнай ідэнтычнасці ў наш час з’яўляецца адной з ключавых у навуцы, грамадскім жыцці, мастацтве. Асаблівую актуальнасць мае яна для Беларусі. Вывучэнне спецыфікі нацыянальнага ў літаратуры заяўлена сёння як першаступенная задача беларускага літаратуразнаўства[1].

Важная роля ў працэсе нацыянальнага самаўсведамлення, у выпрацоўцы нацыянальнай ідэі, канцэпцыі беларускай дзяржаўнасці, у вербалізацыі асноўных прыкмет беларускай ідэнтычнасці належыць нашаніўскім пісьменнікам-адраджэнцам.

Адным з ідэолагаў нацыянальнага беларускага адраджэння з’яўляўся В. Ластоўскі (1883–1938), пісьменнік, публіцыст, вучоны, дзяржаўны дзеяч, „пачынальнік беларускага фундаменталізму”, згодна з вызначэннем Ул. Конана[2]. В. Ластоўскі быў адным з арганізатараў газеты „Наша ніва”, яе адказным сакратаром, правадзейным членам Інстытута Беларускай Культуры, вучоным сакратаром Беларускай Акадэміі навук.

У сваіх артыкулах ён падкрэсліваў:

> „…у нас ляжыць аблогам тэарэтычная пастаноўка беларускага пытання з палітычна-гістарычнага боку і папулярызацыя яго між грамадзянства”[3], „рэдакцыя мае на мэце […] прылажыць усіх высілкаў да адшукання шляхоў к самавызначэнню Беларусі ў сферы духовасці”[4], „мы павінны знайсці саміх сябе ў кожнай дзедзіне духовай і матэрыяльнай творчасці, у сацыяльным укладзе, у рэлігіі і мастацтве”[5].

В. Ластоўскі – аўтар шматлікіх публіцыстычных артыкулаў, дзе сфармуляваны асновы праекта нацыянальнага адраджэння і самаўсведамлення: *Нацыянальнае пытанне, Нашы цэннасці, Уступны артыкул да № 1 часопіса „Крывічанін”, Прадмова да № 1 часопіса „Крывіч”, Прамова ў Жэневе, Прадмова да „Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка”, Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў, Патрыятычны малітвеннік, Прадмова да „Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі”.*

---

[1] М. Т ы ч ы н а, *Феномен пераходнага перыяду. Праблемы тыпалогіі* [у:] *Літаратура пераходнага перыяду. Тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу*, Мінск 2007, 363с.

[2] Ул. К о н а н, *Эстэтычныя погляды Вацлава Ластоўскага*, „Беларусіка=Albaruthenica” 1995, кн. 4, Мінск, с. 240.

[3] В. Л а с т о ў с к і, *Выбраныя творы*, уклад., прадмова і каментарыі Я. Янушкевіча, Мінск 1997, с. 314.

[4] *Ibidem*, с. 323.

[5] *Ibidem*, с. 399.

У сацыякультурным сэнсе ідэнтычнасць – гэта сукупнасць устойлівых рысаў, якія дазваляюць пэўнай этнічнай ці сацыяльнай групе вылучаць сябе сярод іншых. Згодна постнеакласічнаму падыходу, спецыфіка ідэнтычнасці залежыць ад ідэалагічнага ўзроўню грамадства, якое фармулюе мэты, сэнс, стратэгію развіцця. Творчасць В. Ластоўскага адпавядае, згодна з класіфікацыяй І. Бабкова,

> „другой стадыі нацыягенэзы: нарматыўнай альбо праектнай. У гэтай стадыі фармуецца нацыянальная саматоеснасьць з сваёй складанай структурай: міт паходжаньня, міт псыхе, міт парадку і міт будучыні”[6].

В. Ластоўскі абгрунтоўвае нацыянальную ідэю як палітычны, сацыяльны, канфесійны і культурны феномен. У *Прадмове да „Падручнага расійска-крыўскага* (*беларускага*) *слоўніка”* В. Ластоўскі заяўляе пра нацыянальна-самабытны характар Беларусі: „Мы крывічы, а не Русь Літоўская, Варажская ці Маскоўская, Белая ці Чорная, мы асобны славянскі народ, не правінцыяльная чыясь адмена”[7]. Пісьменнік як ідэолаг нацыянальнай незалежнасці гаворыць пра неабходнасць усвядоміць „сваю індывідуальнасць (у мове, у абычаях, у мастацтве і пісьменнасці”)[8], нагадаць пра мінулую незалежнасць.

В. Ластоўскі падкрэслівае важнасць нацыянальнага самаўсведамлення для паўнацэннага быцця:

> „Будучыню перад сабой мае толькі той народ, каторы мае ясна выражаныя індывідуальныя рысы, а не рысы, якія з'яўляюцца адбіццём чужой індывідуальнасці ў мове, у гісторыі, у творчасці і сваім нацыянальным імені”[9].

Ключавую ролю ў працэсе станаўлення нацыянальнай ідэнтычнасці адыгрывае гістарычная свядомасць, супольная гістарычная памяць. Вядома, што адчуванне нацыянальнай прыналежнасці мае як прасторавае, так і часовае вымярэнне. Нацыя – гэта супольнасць са сваім мінулым, сучасным і будучыняй, згодна Б. Андэрсену[10]. Нацыянальная гісторыя – гэта своеасаблівая інтэрпрэтацыя пэўных падзей і асоб, абумоўленая сучаснымі ідэалагічнымі запатрабаваннямі нацыі. Знаны даследчык этнічнасці і нацыянальнага прафесар сацыялогіі Лонданскага ўніверсітэта Энтані Сміт пісаў:

> „Кожная нацыя абумоўлівае самавызначэнне сваіх членаў, таму што яе спецыфічная культура фармуе асобу. Ключом да гэтай культуры з'яўляецца гісторыя, пачуццё гістарычных архетыпаў, якія перадаюцца да новых і новых пакаленняў. [...] Чалавек вызначае сябе, у адпаведнасці з нацыянальнай ідэяй, праз сваю сувязь з продкамі і папярэднікамі, а таксама з падзеямі, якія сфармавалі іх светаўспрыняцце”[11].

Эрык Хабсбаўм адзначаў:

---

6 І. Б а б к о ў, *Генэалёгія беларускай ідэі. Уводзіны*, „Фрагмэнты” 1996, № 1, с. 43.
7 В. Л а с т о ў с к і, *op. cit.*, с. 366.
8 *Ibidem*, с. 384.
9 *Ibidem*, с. 386.
10 Б. А н д е р с о н, *Воображаемые сообщества*, Москва 2001, 182 с.
11 Э. С м і т, *Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі*, Мінск 1995, с. 13.

> „Нацыі без мінулага – гэта свайго роду супярэчлівасць у тэрмінах. Мінулае і ёсць тое, што стварае нацыю; менавіта мінулае нацыі апраўдвае яе ў вачах іншых”[12].

Менавіта В. Ластоўскі адным з першых паспрабаваў сфармуляваць беларускі пункт погляду на ўласную гісторыю ў працы *Кароткая гісторыі Беларусі* (Вільня, 1910). Паказальна, што ў дадзеным выпадку В. Ластоўскім выкарыстоўваецца этнонім *беларусы*, *беларускі*. І гэта, нягледзячы на тое, што аўтар з'яўляўся прыхільнікам так званай крыўскай тэорыі. У прадмове да *Кароткай гісторыі Беларусі* ён пісаў:

> „Гісторыя – гэта фундамент, на каторым будуецца жыццё народа. І нам, каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачаць з фундаменту, каб будынак быў моцны. А фундамент у нас важны, гісторыя наша багата”[13].

Культуролаг В. Булгакаў піша:

> „Нацыяналізм – гэта суб'ектнасьць! Праўда, і ідэнтычнасьць – суб'ектнасьць, і традыцыя – суб'ектнасьць, а каланіялізм – гэта адсутнасьць суб'ектнасьці”[14].

У рабоце В. Ластоўскага гісторыя Беларусі паўстае не як гісторыя аб'екта, а як гісторыя суб'екта: „Адно толькі пазволіў я сабе: некаторыя здарэнні асудзіць па-свойму з становішча карысцей і шкод беларускага народа”[15]. Аналагічныя меркаванні выкладзены ў рэцэнзіі на *Гісторыю Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця* У. Ігнатоўскага:

> „Наша гісторапісь знаходзіцца яшчэ ў зародку, і няма не толькі распрацаваных архіўных матэрыялаў з пункту нашага ўласнага погляду, але найгорш, што яшчэ гэты погляд не выраблены”[16].

У рэцэнзіі на *Гісторыю Беларусі* У. Пічэты В. Ластоўскі падкрэслівае:

> „Нам у нашай гісторыі, у час адраджэння народа, патрэбна аб'ектыўнае абаснаванне яго кроўнага права на самаістасць, а не апраўданне чужацкага панування над намі”[17].

Вызначальнымі ў В. Ластоўскага выступаюць наступныя палажэнні: Беларусь у мінулым мела ўласную дзяржаўнасць: „...гісторыі народа, каторы, не так яшчэ даўно, жыў сваім самаістым палітычным і культурным жыццём”[18]. Беларусь мае ўзоры высокай культуры:

---

[12] Э. Х о б с б а у м, *Принцип этнической принадлежности и национализм в современной Европе* [в:] *Нации и национализм*, Москва 2002, с. 332.
[13] В. Л а с т о ў с к і, *op. cit.*, с. 247.
[14] В. Б у л г а к а ў, *Злыя дэманы беларускай гісторыі*, „ARCHE” 2007, № 9, с. 122.
[15] В. Л а с т о ў с к і, *op. cit.*, с. 248.
[16] *Ibidem*, с. 390.
[17] *Ibidem*, с. 388.
[18] *Ibidem*, с. 424.

> „Канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега хваліўся, кажучы, што мы стаім вышэй за іншыя народы, бо маем законы, напісаныя не ў лацінскай мове, як у іншых гасударствах, а ў сваёй роднай, беларускай”[19]

(артыкулы *Раздзелы і сваркі*, *Прадмова да „Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка”*, *Патрыятычны малітвеннік*, *Прадмова да „Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі”*). В. Ластоўскі адзначае, што раней беларуская мова мела статус дзяржаўнай, з'яўлялася мовай вышэйшых сацыяльных колаў:

> „Наша гістарычная літаратурная мова, на якой пісаліся кнігі і дакументы XV–XVII стст., з'яўляючыся сапраўды мовай той, якой гаварылі нашы вышэйшыя класы…”[20].

Менавіта В. Ластоўскі, разам з М. Багдановічам, закладае ў ідэнтыфікацыйны код беларускай літаратуры матыў велічнага мінулага Беларусі. Высокі ўзровень культуры выступае ў В. Ластоўскага паказчыкам жыццяздольнасці нацыі, аргументам на карысць яе самастойнасці.

Пра В. Ластоўскага можна сказаць ягонымі ж словамі: мэтанакіравана працуе „над утрыманнем беларускай свядомасці”[21], збірае звесткі пра беларускіх пісьменнікаў, артэфакты беларускай культуры. Аб'ём яго ведаў, кругагляд уражвае (артыкулы *Рухомыя друкарні на Беларусі і Украіне*, *Кальвінскія зборы на Беларусі*, *Новагародская аўтакефальная мітраполія*, *Крыўскі варыянт быліны аб Іллі Мурамцы*, *Віленская грэка-лаціна-руская акадэмія*, *Пачайнская друкарня*, *Крыўскі (беларускі) старадаўні лістоўны стыль*, *Беларускія (крыўскія) друкі ў Тыльзіце*). Паказальна, што пісьменнік пастаянна акцэнтуе ўвагу на духоўнасці як вызначальным складніку нацыянальнай самабытнасці, дзяржаўнасці. У тагачасных умовах адстойвання дзяржаўнай і нацыянальнай незалежнасці важнай выступала менавіта стратэгія сцвярджэння духоўнай аўтаноміі.

В. Ластоўскі падае цікавыя звесткі пра гісторыю Беларусі, яе гераічныя старонкі (*Аб лесаўчыках*, *Земскія суды*, *Копныя суды*, *Станы ў старой Беларусі*). Даследчык узгадвае тыя старонкі мінулага, якія сведчылі пра нацыянальную і дзяржаўную сталасць Беларусі: Статуты Вялікага Княства Літоўскага, напісаныя па-беларуску, кнігадрукаванне. У артыкуле *Земскія суды* пісьменнік адзначае:

> „Словам, беларусы ў XVI сталецці мелі ўжо найлепшыя – нават і паводле цяперашняга паняцця – суды, бо суддзі былі выбарныя, дажывотныя і незалежныя ад урада. Цяпер гэткія суды маюць толькі найбольш культурныя заходнееўрапейскія гасударствы ды Злучаныя Штаты Паўночнай Амерыкі”[22].

У артыкуле *Копныя суды* гаворыцца: „Мінуўшчына беларускага народа багата цікавымі формамі грамадзянскага жыцця”[23].

Трэба адзначыць, што не ўсе погляды В. Ластоўскага на гісторыю з'яўляюцца строга навуковымі. Такім чынам, асновай афармлення нацыянальнага міфу ў В. Ластоўскага становіцца міфалагізацыя нацыянальнай гісторыі.

---

19 *Ibidem*, с. 270.
20 *Ibidem*, с. 361.
21 *Ibidem*, с. 277.
22 *Ibidem*, с. 261.
23 *Ibidem*, с. 263.

В. Ластоўскі выбудоўвае пантэон беларускіх дзяржаўных (князь Усяслаў, Леў Сапега, Радзівілы, Хадкевічы), культурных дзеячаў (Сімяон Полацкі, Пётр Мсціславец, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Л. Кандратовіч, Э. Ажэшка) (*Памяці Сяргея Палуяна*, *Пятрок з Крошына*, *Людвік Кандратовіч*, *350-летняя гадаўшчына друку ў Маскоўшчыне*, *Шляхам творчасці*), гістарычных дзеячаў (К. Каліноўскі). У артыкуле *Шляхам творчасці* В. Ластоўскі гаворыць пра розныя ўплывы (культурныя, палітычныя, бытавыя), якія перажываюць народы ў сваім гістарычным жыцці, зазначаючы пры гэтым неабходнасць уключэння ў пантэон беларускіх культурных дзеячаў і тых асоб, якія пісалі на іншых мовах, але „характар далі ў творах сваіх, уласцівы нашаму народу”[24]. В. Ластоўскі адносіць да беларускай культуры тых пісьменнікаў, выхадцаў з Беларусі, якія пісалі па-польску, паколькі ў іх творах ўвасоблена спецыфіка беларускай ментальнасці:

> „Гэтак і мы, беларусы, саўсім справядліва можам шукаць адбіцця сваёй народнай душы ў творах шмат якіх польскіх пісьменнікаў, што былі родам з Беларусі”[25].

Даследчык падкрэслівае дэмакратызм грамадскага жыцця як паказальную рысу беларусаў (*Кароткая гісторыя Беларусі*). Такім чынам, В. Ластоўскі імкнуўся выканаць нацыятворчую мэту: паяднаць народ з яго ўласнаю гісторыяй.

І. Бабкоў, разглядаючы генеалогію беларускай ідэі, адзначае, што ў першай трэці XX стагоддзя ў беларускім інтэлектуальным асяроддзі фармуецца антыкаланіяльная стратэгія:

> „Беларуская рэфлексія першай траціны XX стагодзьдзя апазнае каляніяльнае сутыкненьне паміж той рэальнай прасторай і тым кантэкстам, у якім вымушана знаходзіць сябе беларуская ідэнтычнасьць. Беларуская ідэнтычнасьць набывае рысы выразна антыкаляніяльнага праекту, з базавымі задачамі апазнаваньня і дэканструкцыі калянізатара”[26].

Так, важным у публіцыстычных артыкулах В. Ластоўскага з’яўляецца палітычны, гістарычны, сацыяльны аналіз сучаснага аўтару становішча Беларусі, даследаванне механізмаў і вынікаў каланізацыі. Сярод механізмаў каланізацыі аўтар вылучае перш за ўсё перапісванне гісторыі: „Няма больш занядбанай дзедзіны ў светавой пісьменнасці, як гісторыя паняволеных народаў”[27]. Выключна негатыўныя наступствы мелі таксама забарона беларускай мовы, уніяцкай веры, кніг на беларускай мове, сацыяльны прыгнёт (*Беларусь пад Расеяй*, *Паленне кніг на Беларусі*, *Новы падзел Беларусі*, *Прамова ў Жэневе*, *Патрыятычны малітвеннік*, *Прадмова да „Гісторыі беларускай* (*крыўскай*) *кнігі”*).

Згубны характар мела паленне беларускіх кніг, пачынаючы з XVI стагоддзя ў Рэчы Паспалітай і да XIX стагоддзя пры Расіі:

---

24 *Ibidem*, c. 312.
25 *Ibidem*, c. 268.
26 І. Б а б к о ў, *Генэалёгія беларускай ідэі*, „ARCHE” 2005, № 3, c. 159.
27 В. Л а с т о ў с к і, *op. cit.*, c. 424.

> „Нішчанне кніг і дакументаў мела на мэце не адно фанатычнае прававерства таго ці іншага абрадку, але яшчэ і мэты палітычныя: зацерці, знішчыць мясцовую крыўска-беларускую гісторыю, а на яе месцы прышчапіць сваю, новую”[28],

русіфікацыя царквы, паланізацыя касцёла (*Канкардат*).

Прычына нацыянальнага заняпаду, згодна В. Ластоўскаму, – „доўгае паднявольнае жыццё”, якое „адабрала ад яго (народа – А.М.) характар, цвёрдасць, гордасць нацыянальную, зрабіла яго слугой і нявольнікам, скалечыла яго душу...”[29]. Паднявольнае жыццё, паводле В. Ластоўскага, прыводзіць не толькі да нацыянальнай, але і да маральнай і сацыяльнай дэградацыі. Лёс беларусаў пісьменнік параўноўвае з лёсам іншых паняволеных народаў: ірландцаў (*Аб патрэбе стылю ў жыцці народа*), індусаў (каставы падзел на „чыстых” і „нячыстых”, *Бяздомныя*).

Пры гэтым В. Ластоўскі акрэслівае сутнасць палітыкі каланізацыі: абвясціць каланіяльны народ ніжэйшым у культурных адносінах, вынішчаючы нацыянальную адметнасць і навязваючы ўласную як вышэйшую:

> „Каб падсаладзіць горкую пігулку, вынішчаючы нацыянальны тып, паніжаючы арыгінальнасць перасіленага народа, усе дэнацыяналізатары кажуць, быццам ад іх работы ўзрастае культура і багацце паднявольных народаў”[30].

У артыкуле *Нацыянальнае пытанне* даследчык піша пра вынікі каланізацыі, небяспеку духоўнага нівелявання:

> „...з утратай незалежнасці кожны народ трапляе пад уплыў пераможцы і памалу загубляе сваю індывідуальнасць, а разам з ёй і сваю індывідуальную культуру”[31].

В. Ластоўскі паўстае як вучоны, тэарэтык нацыянальнага, яго артыкулы ўтрымліваюць навуковыя палажэнні пра спецыфіку нацыянальнага, шляхі яе фарміравання (*Нацыянальнае пытанне*, *Нашы цэннасці*, *Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў*, *Унія*, *Патрыятычны малітвеннік*, *Прадмова да „Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі”*). Перш за ўсё даследчык адзначае ўплыў акаляючага асяроддзя на станаўленне нацыянальнай ментальнасці: „Бо мова – гэта плод геаграфічных і гістарычных варункаў народа, яго звычаяў і абычаяў”[32], гістарычныя ўмовы: „Галоўнай астояй нашай індывідуальнасці і крыніцай нашага гістарычнага прызвання ёсць нашы гістарычныя традыцыі”[33]. Што адпавядае сучасным навуковым палажэнням пра механізмы фармавання нацыянальнага. Падкрэслівае, што „літаратура адбівае ў сабе душу народа...”[34].

Асаблівай глыбінёй вылучаецца артыкул *Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў.* На думку аўтара, толькі народ „з ярка выражанымі індывідуальнымі рысамі або ярка акрэсленымі імкненнямі”[35] здольны стварыць дзяржаву.

---

28 *Ibidem*, с. 333.
29 *Ibidem*, с. 237.
30 *Ibidem*, с. 257.
31 *Ibidem*, с. 316.
32 *Ibidem*, с. 280.
33 *Ibidem*, с. 398.
34 *Ibidem*, с. 283.
35 *Ibidem*, с. 396.

Важнай у дактрыне дзяржавы В. Ластоўскага з'яўляецца палажэнне пра гістарычную місію. Паводле В. Ластоўскага, гістарычная місія Вялікага Княства Літоўскага заключалася ў „змаганні з татарскай навалай". Гістарычная місія „заходняй лініі крывічоў", на думку В. Ластоўскага, у яднанні „ўсіх трох галін крывічанскага племя"[36]. Акрамя таго, вучоны фармулюе нацыянальныя задачы нават у сусветным маштабе, і гэтыя задачы звязаны перш за ўсё з культурнай місіяй: „Крывічанская славяншчына ў цэлым павінна даць чалавецтву новыя культурныя цэннасці"[37].

Даследчык адзначае, якую важную ролю ў працэсе нацыянальнага адраджэння адыгрываюць „маральныя нацыянальныя цэннасці": мова, царква, „пачуццё нацыянальнай годнасці", звычаі, гісторыя, традыцыя, ідэалы, ставіць пытанне пра наяўнасць гэтых каштоўнасцей у беларусаў. Выснова В. Ластоўскага наступная:

> „...мы маем цела (народ з інстытуцыйнымі цэннасцямі), але гэтае цела, каб ажывіць, патрэбен жывы дух, патрэбны ідэалы, раўнацэнныя ўсясветным, прапушчаныя праз нашу нацыянальную прызму"[38].

Высновы В. Ластоўскага пра нацыянальнае адпавядаюць сучасным навуковым палажэнням пра структуру этнасу:

> „...як «крывічы» – мы асобны індывідуум, асобнае славянскае племя са сваёй багатай мінуўшчынай, сваёй асобнай мовай, тэрыторыяй і духовай творчасцю"[39].

В. Ластоўскі адзначае, што мова з'яўляецца апірышчам нацыянальнай ментальнасці (*Прадмова да „Падручнага расійска-крыўскага* (*беларускага*) *слоўніка*"): „Увесь светагляд і паэзія нашых прадзедаў замыкаліся ў мове... Слова ёсць творчасцю ўсяго народа..."[40]. Артыкулы В. Ластоўскага сведчаць, што ён глыбока вывучаў гэта пытанне (спасылкі на рускага філосафа і сацыёлага П. Лаўрова (1823–1900), нямецкага філосафа, педагога Э. Шпрангера (1882–1963), англійскага філосафа, псіхолага, сацыёлага Г. Спенсера, К. Каўцкага, англійскага гісторыка і сацыёлага Т. Бокля.

В. Ластоўскі піша пра беспадстаўнасць падзелу народаў на „вышэйшыя" і „ніжэйшыя", „выбраныя" і „барбарскія"[41], гаворыць пра правы нацый на незалежнае дзяржаўнае і культурнае жыццё (*Нацыянальнае пытанне*).

Істотным фактарам нацыянальнай ідэнтычнасці выступае сістэма рэлігійных поглядаў. В. Ластоўскі ставіць пытанне пра неабходнасць „самаакрэсліцца з рэлігійнай стараны":

> „Патрэбна ўтварэнне такой формы хрысціянскай царкоўнай арганізацыі, якая бы, не аглядаючыся ні на ўсход, ні на захад, стаяла на грунце нашых нацыянальных інтарэсаў"[42].

---

36 *Ibidem*, с. 399.
37 *Ibidem*.
38 *Ibidem*, с. 322.
39 *Ibidem*, с. 386.
40 *Ibidem*, с. 360.
41 *Ibidem*, с. 316.
42 *Ibidem*, с. 414.

В. Ластоўскі гаворыць пра важнасць для нармальнага культурнага, дзяржаўнага жыцця нацыянальнай царквы, царкоўнай аўтаноміі (*Новагародская аўтакефальная мітраполія*, *Канкардат*). У артыкуле *Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў* піша: „Рэлігійнай індывідуальнасці ў нас няма, а яшчэ горш – няма волі знайсці сабе рэлігійную індывідуальнасць"[43].

Адзначае В. Ластоўскі адноснасць канфесійнага размежавання: „Хаця розныя гэтыя святыні, розныя веры, аднак племя тут жыве адно, адзінкавы скрозь народ беларускі"[44], негатыўныя моманты гэтага размежавання (*Раздзелы і сваркі*). В. Ластоўскі падкрэслівае важнасць паганскага мінулага ў фармаванні нацыянальнага светапогляду беларусаў (*Колькі слоў аб даўняй веры беларусаў*, *Каляды*, *Да шукання крыніц народнай творчасці*, *Унія*).

У скрупулёзным артыкуле *Унія* В. Ластоўскі даследуе гісторыю станаўлення і вынішчэння ўніі на беларускіх землях. Ён піша пра хрысціянства як рэлігію заваёўнікаў варагаў-русаў, а не спрадвечна беларускую веру:

> „На крыўскіх і ўкраінскіх землях хрысціянства шырылася разам з заваяваннямі іх варагамі-руссю. Хрысціянства было верай заваёўнікаў, верай русаў, – рускай верай"[45].

Такія погляды В. Ластоўскага вынікалі з яго апоры на аўтэнтычную народную культуру.

В. Ластоўскі быў адным з першых, хто паставіў пытанне пра нацыянальны стыль (*Аб патрэбе стылю ў жыцці народа*): „Стыль – гэта наша душа, душа народа, стыльнасць – адбіццё нашай душы на нашых творах"[46].

Сіла нацыі, на думку В. Ластоўскага, залежыць ад глыбіні самаўсведамлення сваёй далучанасці да супольнасці, што адпавядае навуковым уяўленням пра працэс ідэнтыфікацыі:

> „Найбольш сілы мае той народ, каторы патрапіў усіх сваіх членаў злучыць у адно, дзе ўсе думаюць і пачуваюць, як адзін чалавек, а кожын – так, як усе, хто належыць да гэтай нацыі, творачы, аднак, такую гарманічную цэласць, што аддзельныя асобы могуць найшырэй выявіць усе свае асобеннасці, усю арыгінальнасць сваёй творчасці"[47].

Больш за тое, В. Ластоўскі ставіць пытанне: які ўклад могуць унесці беларусы ў агульнасусветную скарбонку: „Каб заваявацьме ў агульналюдскай культуры, павінны не толькі браць з агульналюдскай скарбніцы, але і класці ў яе раўнацэнныя"[48].

Асноватворным у В. Ластоўскага выступае пытанне мовы, яе занядбання ў сучасным (*З нашага жыцця*, *Як паступаць, каб дзеці, вырасшы, шанавалі сваіх бацькоў і былі ім апорай на старасць*, *Перапіска ў беларускай мове*, *Раздзелы і сваркі*,

[43] *Ibidem*, с. 397.
[44] *Ibidem*, с. 253.
[45] *Ibidem*, с. 401.
[46] *Ibidem*, с. 256.
[47] *Ibidem*, с. 256.
[48] *Ibidem*, с. 322–323.

*Родная мова*, *З-пад праху вякоў*, *Прадмова да „Падручнага расійска-крыўскага* (*беларускага*) *слоўніка"*, *Патрыятычны малітвеннік*, *Прадмова да „Гісторыі беларускай* (*крыўскай*) *кнігі"*). В. Ластоўскі падкрэслівае старажытны характар беларускай мовы: „У нашай беларускай мове, як, можа, нідзе ні ў якой іншай, багата слоў такіх, каторыя па тысячы і болей гадоў пратрывалі і дажылі да нашых часоў"[49]. Высновы пра спецыфіку беларускага, сфармуляваныя В. Ластоўскім, актуальныя і ў наш час.

Беларуская мова пачатку XX стагоддзя атаясамліваецца В. Ластоўскім з мовай ніжэйшых сацыяльных слаёў, руская і польская мовы – мовы паноў, заваёўнікаў

> „ён, калі хоча паказацца разумнейшым або далікатнейшым, то панскай мовай загаворыць, а не сваёй, бо рабская ягоная душа і розум цёмны прымушаюць лічыць усё сваё, хаця бы найлепшае, нечым горшым"[50], „уся блізкая шляхта сталася польскай, гарады таксама страцілі наш беларускі характар"[51].

На думку В. Ластоўскага, прычына гэтага – здрада шляхты і магнатаў нацыянальнай культуры ў выніку двухсотгадовага жыцця ў Рэчы Паспалітай: „...дык беларусы трапілі пад Расею толькі як стан сялянскі"[52] (*Беларусь пад Расеяй*, *Аб назовах „Крывія" і „Беларусь"*).

Паказальна, што беларуская мова маркіруецца пісьменнікам як мова „простых людзей", а лёс мовы праецыруецца на лёс Хрыста:

> „Нарадзіўся Хрыстос, каб узрасці сярод прастакоў, набраць вучнёў, людзей простых, і павучаць народ у мове простай, роднай мове, каторую яны выссалі разам з малаком з грудзей матак сваіх"[53] (*Хрыстос нарадзіўся*!).

Ул. Конан на гэты конт слушна адзначыў: „Маральна-эстэтычная і экзістэнцыяльная каштоўнасць роднае мовы – асноўная тэма В. Ластоўскага як публіцыста і лексіколага"[54].

В. Ластоўскі выступае як супраць русіфікацыі, так і супраць апалячвання (артыкулы *З падарожы па Гродзеншчыне*, *Прадмова да „Падручнага расійска-крыўскага* (*беларускага*) *слоўніка"*, *Аб назовах „Крывія" і „Беларусь"*, *Паленне кніг на Беларусі*):

> „Палякі даводзілі, што беларускае адраджэнне – гэтая хітрая інтрыга правіцельства, каторае хоча, збудзіўшы беларусаў да новага жыцця, зрабіць іх расейцамі, а расейцы казалі, што беларускі рух – гэта польская інтрыга"[55].

Цікавую заўвагу на гэты конт зрабіў польскі даследчык Р. Радзік. Не пагаджаючыся з ацэнкай В. Ластоўскім саюзу з Польшчай як згубнага для Беларусі, вучоны піша: „Бясспрэчна, прабеларускае нацыянальнае мысленне дамінуе

---

[49] *Ibidem*, с. 297.
[50] *Ibidem*, с. 237.
[51] *Ibidem*, с. 259.
[52] *Ibidem*, с. 319.
[53] *Ibidem*, с. 99.
[54] Ул. К о н а н, *op. cit.*, с. 246.
[55] В. Л а с т о ў с к і, *op. cit.*, с. 267.

ў Ластоўскага над гістарычнай кампетэнтнасцю”[56]. Мысленне В. Ластоўскага польскі даследчык характарызуе як агістарычнае:

> „Погляды Ластоўскага шмат у чым агістарычныя. Ён характарызуе мінулае праз уласныя, нацыянальныя катэгорыі мыслення (пад нацыяй разумецца моўна-этнічная супольнасць), неўласцівыя грамадству даўняй Беларусі… Мужыкам, якія на працягу стагоддзяў кіраваліся пераважна класавай свядомасцю, часта прыпісваюцца нацыянальныя матывы (нацыянальная свядомасць)”[57].

Аднак паказальная ацэнка Р. Радзікам В. Ластоўскага як носьбіта беларускай ідэалогіі. Р. Радзік таксама слушна адзначае, што беларускае пачатку XX стагоддзя атаясамліваецца ў В. Ластоўскага з ніжэйшымі сацыяльнымі слаямі. Даследчык лічыць такі стан вынікам прызнання В. Ластоўскім расійскіх навуковых падыходаў да Беларусі, што сведчыць пра слабасць тагачаснай беларускай нацыянальнай ідэалогіі:

> „Такі адмысловы агістарызм абумоўлены крытэрыямі культурна-нацыянальна-класавага падзелу, навязанымі Масквой у часы тэрытарыяльных захопаў. «Паны» – гэта тыя, якія згодна тагачаснай трактоўцы падзей прадстаўлялі не інтарэсы мясцовага народу, але чужыя яму інтарэсы – класавыя, дзяржаўныя, («польскія»), а часта і рэлігійныя («каталіцкія»). Ластоўскі лёгка падпадае пад уплыў такога мыслення. Беларускасць, паводле ягонага меркавання, уласціва простаму люду; эліты паступова пачынаюць прадстаўляць польскія інтарэсы”[58].

Зрэшты, Р. Радзік адзначае, што галоўнай мэтай працы В. Ластоўскага было фарміраванне новай нацыянальнай ідэі, мабілізацыя нацыі на змаганне за сваю незалежнасць шляхам міфалагізацыі гісторыі: „Беларусы ў гэтым выпадку не адрозніваліся ад астатніх”[59].

Побач з нацыянальна-духоўнай ідэнтыфікацыяй адбываецца працэс нацыянальна–духоўнай дыферэнцыяцыі, які заключаецца ў адрозненні сябе ад іншых. У артыкулах В. Ластоўскага мы наглядаем выразнае размежаванне паміж „Я” і „Іншы”: „…беларус можа вытварыць сваю ўласную культуру, пачаць жыць сваім асобным жыццём”[60], спробу ўзняць нацыянальную самапавагу: „Ёсць такія, што апярэдзілі нас, але ёсць і такія, што далёка такі за намі асталіся ззаду”[61]. Асэнсоўваючы Беларусь у кантэксце Расіі і Польшчы, падкрэслівае перавагу Беларусі ў мінулым: „Маскоўшчына была тады вельмі адсталай старонкай…”[62].

Акцэнт у артыкулах В. Ластоўскага – на пакутах, што перажывае Беларусь у сучасным: „Каб знайсці на Зямлі-Матцы роўна нешчаслівую старонку як Бела-

---

[56] Р. Радзік, *Погляд на Польшчу і Расію ў „Кароткай гісторыі Беларусі” Вацлава Ластоўскага*, „Беларусіка=Albaruthenica” 2010, кн. 20, *Скарыназнаўства, кнігазнаўства, літаратуразнаўства. Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў „Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый”*, Мінск, с. 264.

[57] *Ibidem*, с. 265.

[58] *Ibidem.*

[59] *Ibidem*, с. 269.

[60] В. Ластоўскі, *op. cit.*, с. 266.

[61] *Ibidem*, с. 272.

[62] *Ibidem*, с. 285.

русь і роўна бяздольны народ як беларусы, трэба далёка шукаць прыкладаў...”[63]. Такім чынам, супрацьпастаўленне велічнага мінулага панявольнаму сучаснаму таксама закладвалася ў ідэнтыфікацыйны код нашаніўскімі пісьменнікамі. Побач з негатыўнымі ацэнкамі сучаснага ў творах В. Ластоўскага пададзена і праграма стваральнага дзеяння: „Мы павінны знайсці ў сябе і даць свету новыя думы, сказаць новае слова”[64].

Падкрэслівае В. Ластоўскі поліэтнічны характар Беларусі, беларускую талерантнасць (*Назова Беларусі па-жыдоўску*):

> „Тэрыторыя «Rajsen», уласціва Беларусь, займае выдатнае месца ў гісторыі духовага жыцця ўсходнееўрапейскіх жыдоў. Згэтуль выйшлі найслаўнейшыя імёны жыдоўскіх тэолагаў і талмудзістаў, з Магілёўшчыны чэрпаў духовае цяпло хасідызм, а валожынскія духоўныя школы выдавалі найбольш паважаных за вучонасць паміж жыдамі ўсёй Еўропы рабінаў”[65].

І. Бабкоў на гэты конт слушна заўважае:

> „Беларусь як праект канца XIX стагодзьдзя, праект культуры нацыянальнай, г. зн. мэта-культуры і быў запачаткаваны як спроба мэта-наратыву, як спроба культурнай цэльнасьці і цэласнасьці, у якім усе гэтыя ўзаемавыключныя рознасьці знайшлі б сваё мейсца”[66].

Сакралізацыя роднай прыроды выступае ў артыкулах В. Ластоўскага як антытэза сацыяльнаму становішчу:

> „Толькі нідзе такой харошай, такой ціхай прыроды не бачыў я. Ваш край – гэта дзіўная казка, дзіўная краса крыецца ў яго пагурках, гаях, лугах і рэках”[67] (*Сплачвайце доўг*).

Звяртаецца В. Ластоўскі і да праблемы страты нацыянальнай памяці, нават назвы зямлі [*Аб назовах „Крывія” і „Беларусь”*, *Прадмова да „Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка”*, *Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў*]. У *Прадмове да „Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка”* В. Ластоўскі праводзіць так званую крыўскую ідэю: „...наша сапраўднае племянное і нацыянальнае найменне ёсць крывічы”[68]. У артыкуле *Аб назовах „Крывія” і „Беларусь”*:

> „Таксама і наш народ у сваёй тысячалетняй гісторыі насіў тры імені: крывічы, літвіны, русь. Разбіраючы гэтыя тры імені па іх гістарычнаму значэнню, згодна ўсім даным, толькі першае імя ёсць нашым уласным. Самім народам сабе дадзеным (крывічы – родныя сабе па крыві, сваякі), а два другія былі нам пакінуты са стараны”[69].

---

[63] *Ibidem*, с. 281.
[64] *Ibidem*, с. 284.
[65] *Ibidem*, с. 318.
[66] І. Б а б к о ў, *Этыка памежжа: транскультурнасьць як беларускі доьсвед* [у:] *Анталёгія сучаснага беларускага мысленьня*, Санкт-Петербург 2003, с. 75–76.
[67] В. Л а с т о ў с к і, *op. cit.*, с. 273.
[68] *Ibidem*, с. 364.
[69] *Ibidem*, с. 384.

У артыкуле *Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў* В. Ластоўскі адзначае:

> „Вялікае значэнне ў гісторыі і ў жыцці народаў мае іх нацыянальнае імя. Імя народа або яго злівае і змешвае з другімі, або яго аддзяляе ад другіх. [...] Дзеля гэтага нас не можа задаволіць імя беларусы. «Беларусы» – гэта пераходная ступень, часць цэлага рускага [...] Другое нашае гістарычнае імя – літва – не абдымала цэласці, а толькі адну, заходнюю галіну нашага племя [...]. Адзіна імя крывічы абдымае ўсе галіны нашага племя, і яно даволі выразіста адцяняе нашу індывідуальнасць у гістарычнай мінуўшчыне”[70].

Ул. Конан, асэнсоўваючы погляды В. Ластоўскага, пісаў:

> „Гэты тып светапогляду выявіўся ў ідэалізацыі, нават апалагетыцы старадаўняга крывіцка-беларускага паганства, у крытыцы хрысціянскага ўніверсалізму і касмапалітызму, у інтэнсіўнай нацыянальнай міфатворчасці, урэшце, у фундаменталісцкай канцэпцыі беларускай гісторыі і культуры, паводле якой Беларусь, або Крывія, пачалася ў дахрысціянскія вякі як вялікая дзяржава, што ахоплівала значную частку ўсходнеславянскіх плямёнаў і летапісную Літву”[71].

Важнай у дактрыне беларускага, паводле В. Ластоўскага, выступае эстэтызм мыслення:

> „Беларусь па прыродзе сваёй пясняр-паэт. Просты народ наш расказвае тысячы дзіўных казак, каторымі адрывае думкі свае ад цяжкага жыцця і пераносіцца ў хмары, будуе сабе дзіўныя залатыя і сярэбраныя палацы”[72].

Так, апафеозам народнай творчасці і эстэтыкі бачыцца даследчыку свята Купалле: „Свята Купалы павінна быць у нас святам паэзіі, звязкам нашым з прадзедамі і прашчырамі нашымі”[73].

Паказчыкам сфармаванай, сталай нацыянальнай ідэнтычнасці з’яўляецца імкненне да нацыянальнай незалежнасці. Так, згодна даследчыку Б. Андэрсену, галоўнае ў нацыянальнай ідэнтычнасці – гэта ўсведамленне ўласнай адметнасці і натуральнасці ўласнай дзяржаўнасці[74]. В. Ластоўскі ставіць пытанне пра дзяржаўную незалежнасць Беларусі: „Мы думаем, што Беларусь мае ўсе эканамічныя шансы да незалежнага дзяржаўнага будавання...”[75].

Генеалогія беларускай дзяржаўнасці выводзіцца В. Ластоўскім ад Полацкага і Тураўскага княстваў, Вялікага Княства Літоўскага. З князёў Вялікага Княства Літоўскага В. Ластоўскі ўзгадвае Вітаўта, Ягайлу, Кейстута, Гедыміна, Жыгімонта.

Істотны складнік нацыянальнай ідэнтыфікацыі – сацыяльны паказчык. Характэрна, што ў мастацкіх творах В. Ластоўскага элітарнае (вобразы князёў, вучоных, асветнікаў) натуральна ўключаецца ў склад нацыянальнага. Пазней класічную беларускую літаратуру традыцыйна вызначалі як антыэлітарную. Так, польскі даследчык Р. Радзік, аналізуючы *Новую зямлю* Якуба Коласа, адзначаў:

---

[70] *Ibidem*, с. 399.
[71] Ул. К о н а н, *op. cit.*, с. 240–241.
[72] В л а с т, *Купалле*, „Наша ніва” 1912, 31 мая.
[73] В л а с т, *Купалле*, „Наша ніва” 1911, 1 ліпеня.
[74] Б. А н д е р с о н, *Воображаемые сообщества*, Москва 2001, 182 с.
[75] В. Л а с т о ў с к і, *op. cit.*, с. 314.

„Коласава ж беларускасць (тэрміналагічна, праўда, неакрэсленая) у прынцыпе абмяжоўвалася мужыцкасцю ды вясковасцю, без усялякіх спробаў дадаць да яе зерне элітарнасці…”[76].

Такім чынам, першаступенная роля ў працэсе нацыянальнага самаўсведамлення належыць В. Ластоўскаму. В. Ластоўскі абгрунтоўвае нацыянальную ідэю як палітычны, сацыяльны і культурны феномен. Важнай у гэтай дактрыне выступае палажэнне пра памежны характар Беларусі і вынікі такога становішча.

*Anzhela Melnikava*

**Issues of national identity in the journalistic writings of Vaclau Lastouski**

A b s t r a c t

The article presents the views of Vaclau Lastouski, a leading ideologist of the Belarusian Renaissance of the early decades of the 20th century, on the issues of national identity of the Belarusians. An important basic assumption for V. Lastouski was that of a borderland location of Belarus and its consequences. Historical determinants play a key role in V. Lastouski's journalistic writings. The article treats his nationality idea as a social, religious and cultural phenomenon and presents the mechanisms and consequences of colonisation.

[76] Р. Р а д з і к, *„Новая зямля”. Вобраз грамадства ў паэме Якуба Коласа* [у:] *Беларусь і беларусы ў прасторы і часе. Зборнік да 75-годдзя прафесара Адама Мальдзіса*, пад рэд. С. З а п р у д с к а г а і інш., Мінск 2007, с. 295.